Падтрымай "Вясну" на PATREON

Ушанаванне памяці паўстанцаў Каліноўскага: штогод - пратаколы і штрафы

25.11.2016 **Тэгі**: адміністратыўны пераслед, акцыі, свабода мірных сходаў



Акцыя ў Свіслачы, фота volkovysk.by

Акцыя ўшанавання памяці паўстанцаў Кастуся Каліноўскага, якая традыцыйна праходзіць у Свіслачы і Якушоўцы, гэтак жа традыцыйна завяршаецца складаннем пратаколаў адміністрацыйнага правапарушэння на ўсіх удзельнікаў, прычым супрацоўнікі міліцыі не абцяжарваюць сябе прадстаўленнем якіх-небудзь істотных доказаў. Так 24 лістапада ў аддзяленне міліцыі быў выкліканы слонімскі актывіст **Павел Севасьцян**. Паводле пратакола, ён з'яўляўся ўдзельнікам несанкцыянаванага масавага мерапрыемства. Аднак сам актывіст кажа, што яго не было ні на могілках, ні і ў складзе арганізаванай калоны, што прайшла да помніка Каліноўскаму, як гэта пазначылі міліцыянты, паколькі ён спазніўся на мерапрыемства.

Яшчэ большы абсурд учынілі супрацоўнікі міліцыі, якія склалі пратакол на актывіста з Ліды **Валерыя Мінца**. Ён увогуле 30 кастрычніка не быў у Свіслачы.

Гарадзенскаму актывісту **Эдварду Дмухоўскаму** міліцыя даслала адміністрацыйны пратакол па пошце. Яго вінавацяць у парушэнні ч. 1 арт. 23.34 КаАП РБ. Нібыта ён парушыў парадак правядзення масавых мерапрыемстваў, удзельнічаў ў мітынгу ў Свіслачы.

Таксама па пошце атрымаў пратакол правапарушэння і грамадскі актывіст з Менску, вядомы бард **Зміцер Захарэвіч**. Позву з патрабаваннем з'явіцца ў Свіслацкі РАУС атрымаў старшыня Партыі БНФ **Аляксей Якукевіч.**

"Гарадзенская Вясна" паведамляе аб тым, што пратаколы правапарушэння за ўдзел у Дні памяці паўстанцаў 1863 году складзены таксама на актывіста з Бярозаўкі **Вітольда Ашурка,** і жыхара Слоніма **Віктара Марчыка.**

Раней, 18 лістапада, адбыўся першы суд па адміністрацыйнай справе за ўдзел у Дні памяці паўстанцаў 1863 году. старшыня Свіслацкага раённага суда Аляксандр Шылін пастанавіў пакараць грамадскага актывіста **Юры Глебіка** штрафам у памеры 40 базавых велічынь, прызнаўшы вінаватым па артыкуле 23.34 КаАП РБ (парушэнне парадку арганізацыі ці правядзення масавага мерапрыемства).

Традыцыя ўшанавання памяці паўстанцаў Кастуся Каліноўскага ў Свіслачы і Якушоўцы закладзеная больш за дзесяць гадоў таму. Ніводная акцыя за гэты час не прайшла без складання пратаколаў на яе ўдзельнікаў, тых, хто шануе сваю гісторыю і ганарыцца сапраўднымі героямі Беларусі.

Твитнуть







Будаўніка асудзілі да "хатняй хіміі" за ўдзел у Маршы

Заява праваабаронцаў Беларусі аб прызнанні дзевяці палітычных зняволеных

Бабруйчаніна будуць судзіць за "публічныя заклікі да арганізацыі мітынгу". Распавядаем, што гэта за артыкул

"Не менш за 100 000 чалавек укрыліся за мяжой". Выйшаў даклад УВКПЧ ААН пра сітуацыю ў Беларусі (дакумент)

WWW.GAZETABY.CO

ПЕНІНТЭНЦЫЯРНАЯ СІСТЭМА



Палітвязня Вадзіма Гурмана, які мае сур'ёзныя праблемы са зрокам, катуюць у горацкай калоніі

"Гэта была аддушына — сустрэць свайго аднадумца", — былыя палітвязні пра этап у адным вагоне

"КДБ думаў, што мы ботаферма", — былая палітзняволеная па "справе Зельцэра"

У СІЗА-1 існуе "прэс-хата"? Сабралі сведчанні былых вязняў



ГАЛОЎНАЕ







АПОШНІЯ НАВІНЫ

Заява праваабаронцаў аб прызнанні 11 палітычных зняволеных

Старэйшыну баптысцкай царквы “Новая Зямля” Андрэя Мамойку і яго жонку Веру асудзілі да “хатняй хіміі”

Будаўніка асудзілі да "хатняй хіміі" за ўдзел у Маршы

Шэсць еўрапейскіх парламентарыяў сталі "хроснымі" для беларускіх палітвязняў

Да 20 гадоў калоніі: фігурантам "справы Nexta" запрасілі тэрміны

Затрыманне футбольнага фаната, новы "тэрарыст": хроніка пераследу 21 красавіка (дапоўнена)

Былога ўчастковага асудзілі да 6 гадоў калоніі па справе "Чорнай кнігі Беларусі"

"Не хацелася, каб хтосьці трапляў туды". Экс-палітзняволены Аляксандр Бабко распавёў пра пераслед па "справе цюкоў"

Затрыманні ў Брасце і Віцебску пасля райда па санэтках: хроніка пераследу 20 красавіка

МАНІТОРЫНГ ПАРУШЭННЯЎ

Сітуацыя з правамі чалавека ў Беларусі. Сакавік 2023







ПАРТНЁРСТВА

СЯБРОЎСТВА

























E-mail: viasna@spring96.org | Пры выкарыстанні матэрыялаў сайта актыўная спасылка абавязковая | RSS

CC BY